# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА В. С. КУЛАГІНАЙ



**В. С. Кулагіна, кіраўнік групы**

**Перыяд дзеяння:**

жнівень 1941 г. – лістапад 1943 г.

**Месца дзеяння:**

Кастрычніцкі раён г. Віцебска і в. Букаціна Віцебскага раёна

**Колькасць:**

невядома

**Кіраўнікі:**

Кулагіна Вера Сямёнаўна («Ліса»)

Дзейнічала ў в. Букаціна Віцебскага раёна і г. Віцебску са жніўня 1941 г. да лістапада 1943 г. Кіраўнік В. С. Кулагіна («Ліса»). У групу ўваходзілі: яе маці Ганна Іванаўна, сёстры Марыя і Ганна, сваяк Сяргей Аляксандравіч Кулагін, В. М. і А. М. Гарновы, А. Ц. і П. Ц. Юпатавы, І. Л. і Ф. Л. Юпатавы, Мікалай Васілевіч і Ніна Васілеўна Азеўшы, В. Ф. Фёдарава. Муж і жонка К. М. і Ф. І. Анісімавы, А. І. і І. М. Арловы вялі падпольную работу ў Віцебску.

Ужо ў жніўні – снежні 1941 г. падпольшчыкі накіравалі ў партызаны многіх ваеннаслужачых, якія трапілі ў акружэнне і хаваліся ў прыгарадных лясах, сабралі вялікую колькасць зброі і боепрыпасаў. Ф. Л. Юпатава па заданні кіраўніка партызанскай групы М. Ф. Біруліна звязалася з сёстрамі Гваздзёвымі з в. Лужасна (пазней – падпольная група З. Н. Гваздзёвай), а В. С. і М. С. Кулагіны – з падпольнай групай Ф. П. Грунтова (15 чалавек) з вучгаса «Падбярэззе», дзе знаходзіліся варожыя гарнізоны.

Патрыёты перадавалі звесткі аб гарнізонах, забяспечвалі партызан медыкаментамі і перавязачным матэрыялам. Наладзілі сувязі з падпольнымі групамі І. А. Бекішава, М. А. Журынскай, В. М. Арлоўскага, А. А. Сакаловай, аператыўна-чэкісцкай групай А. П. Максіменкі, армейскай разведгрупай Ю. С. Рудакова («Жорж», «Ягор»), з адказным арганізатарам абкама КП(б)Б па гораду В. Р. Кудзінавым. У выніку звесткі падпольшчыкаў, што прызначаліся для партызан, аб перамяшчэнні праціўніка, будаўніцтве ўмацаванняў і іншыя сталі больш дакладнымі. Ад партызан атрымлівалі лістоўкі, газеты, міны, заданні для іншых падпольных груп. Патрыёты выводзілі ў партызанскія атрады ваеннапалонных і моладзь.

З вясны 1943 г. В. С. Кулагіна стала сувязной Віцебскага падпольнага гаркама КП(б)Б і начальнікам агентурнай разведкі Буеўскага атрада 1-й Беларускай партызанскай брыгады. Па заданні разведчыка М. А. Шпакава яна з дапамогай С. А. Кулагіна сабрала звесткі аб варожых гарнізонах уздоўж дарогі Віцебск – Янавічы, аб аэрадроме пад Янавічамі. І. М. Арлоў, які працаваў у домакіраўніцтве ў Віцебску, забяспечваў жыллём і прапіскай разведчыкаў і сувязных. 27 снежня 1942 г. партызаны з дапамогай удзельнікаў падпольных груп Кулагінай і Грунтова разграмілі варожы гарнізон на тэрыторыі вучэбнай гаспадаркі «Падбярэззе».

У верасні 1942 г. сям’я Кулагіных пайшла да партызан. У канцы 1942 г. арыштаваны і закатаваны гітлераўцамі І. М. Арлоў, загінуў С. А. Кулагін. Да восені 1942 г. В. С. Кулагіна, В. М. Гарнова, муж і жонка Анісімавы прымалі актыўны ўдзел у дыверсіях на чыгунцы.

Усе сёстры Кулагіны атрымалі высокія ўзнагароды. У скарбонцы кіраўніка групы В. С. Кулагінай – ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 2-й ступені, медаль.

За вялікую грамадскую працу, значны ўклад у развіццё горада 4 мая 1995 года Кулагінай В. С. прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Віцебска». Памерла Вера Сямёнаўна 8 снежня 2008 года. 26 чэрвеня 2015 года на доме, дзе апошнія гады жыцця правяла В. С. Кулагіна (вул. Урыцкага, 12/23), урачыста адкрыта мемарыяльная дошка.




**Мемарыяльная дошка удзельніцы Вялікай Айчыннай вайны, кіраўніку групы партыйна-патриотческого падполля, грамадзяніну г. Віцебска Кулагінай Веры Сямёнаўне на доме па вул. Урыцкага, 12/23 у г. Віцебску**
Крыніца фотаздымка: https://vkurier.by

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група В. С. Кулагінай / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 488–489.

2. **Подпольная** группа Кулагиной В. С. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 289.